**Шчэрба С.М. (Брэст)**

## Творчасць Максіма Багдановіча і музыка: культуралагічны аспект

Сёння, у эпоху цывілізацыйнага крызісу, імклівай змены каштоўнасных уяўленняў, ідэалагічных установак, асаблівае значэнне набываюць пытанні ўключэння літаратуры ў кантэкст мастацтва, у кантэкст маральна-этычных каштоўнасцей грамадства, фарміравання ў чалавеку гуманітарнай культуры – культуры перажывання.

Абмежавацца адным толькі відам мастацтва пры гэтым недастаткова, таму што пры такім падыходзе мы пакідаем убаку іншыя высокія дасягненні творчага Духу. Цеснае ўзаемадзеянне розных відаў мастацтва абумоўлена перш за ўсё іх генетычнай роднасцю – мастацка-вобразнай прыродай, звернутай да ўнутранага свету асобы. Музыка, паэзія, жывапіс – гэта, па словах М. Когана, розныя межы цэласнай сферы мастацкага засваення чалавекам свету, якія ўвасабляюць у сабе ўніверсальнасць эстэтычнага багацця быцця. Ніводнае з мастацтваў не здольнае поўнасцю вычарпаць унутраны мікракосм чалавека, бо яно абмежаванае ў сваіх магчымасцях, але сістэма мастацтваў, сям’я муз – універсальныя.

Тое, што мастацтвы роднасныя паміж сабой, людзі адчувалі ўжо вельмі даўно. Яшчэ ў грэчаскай міфалогіі апавядаецца пра музы мастацтваў, якія былі роднымі сёстрамі, дачкамі Зеўса і Багіні памяці Мнесімоны: Эўцерпа – муза лірыкі, Эрата – апякунка любоўных песень, Палігімнія – заступніца святых гімнаў, Каліёпа – муза эпасу і красамоўства, Талія – апякунка камедыі, Мельпамена – заступніца трагедыі. У іх роднасці заключаецца глыбокі сэнс. Міф пра музы, як і многія іншыя, у вобразнай форме адлюстроўвае тое, што ў старажытнасці мастацтвы былі звязаны адно з адным больш цесна, чым у наш час. Паэзія і музыка існавалі ў выглядзе адзінага сінкрэтычнага мастацтва – песні, у трагедыях і камедыях таксама абавязкова хорам выконваліся музычна-паэтычныя рэплікі. Таму ўсе музы мастацтваў увасаблялі сабой не розныя віды, а розныя жанры ўнутры адзінага сінкрэтычнага музычна-паэтычнага мастацтва.

М. Багдановіч адным з першых адчуў, якое ўздзеянне на чалавека мае музыка. Музыка як адзін з самых таямнічых і шматгранных відаў мастацтва, які дапускае мноства тлумачэнняў і інтэрпрэтацый, адкрывае і новыя магчымасці для спасціжэння паэзіі. Да гэтай тэмы М. Багдановіч звярнуўся ўжо ў першым творы – алегарычным апавяданні «Музыка». У ім сцвярджаецца думка, што сапраўдная музыка сее ў душах людзей святую праўду, абуджае іх ад сну, кліча да змагання за свабоду: «Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы: так і ўдарыўся б груддзю аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваёй долі…

А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў у вачах людзей і тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, дзваніць рымка, бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і завець ён народ. І людзі падымалі апушчаныя галавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы» [2, с. 6].

Таямніцу грання музыкі на скрыпцы ніхто не мог растлумачыць, таму што яна хаваецца ва ўнутраным свеце творцы, у яго творчай душы: «Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора» [2, с. 7].

У вершы «Ліст да п. В. Ластоўскага» М. Багдановіч таксама закранае тэму музычнага мастацтва, калі згадвае пра двух вялікіх кампазітараў – Моцарта і Сальеры – герояў «Маленькіх трагедый» А.С. Пушкіна. Беларускі паэт не можа пагадзіцца з прысудам, які вынес рускі класік кампазітару Сальеры. М. Багдановіча захапляе ў ім тое, што Сальеры шмат працаваў над творам, шліфаваў і адточваў яго, даводзіў да мастацкай дасканаласці: «Уменне да ігры Сальеры здабываў / Праз мерны, нудны труд; ці спраўдзі забіваў / Ён гэтым талент свой, як бачна з думак драмы? / Адкажа й скрыпка нам. Стаката, фугі, гамы / Шмат год калісь на ёй Сальеры вывадзіў / І моцна йграннем тым іскрыпкі зык змяніў, / Ямчэй яна гудзіць. Пявучых згукаў сіла / Праз доўгія гады яе перарабіла, / І тымі спевамі уся напоена. / Навекі чулаю зрабілася яна» [1, с. 264]. На прыкладзе руплівай працы Сальеры над сваім граннем М. Багдановіч сцвярджае думку, што паэту таксама неабходна добра абдумваць твор, і «спосабы, і матар’ял, і мэту», штодзённа, дбайна працаваць над стылем.

Даніну музычнаму пачатку аддае М. Багдановіч у вершы «Маёвая песня», дзе эпіграфам ставіць выраз П. Верлена «Музыкі перш за ўсё». У творы гучыць музыка прыроды, песня вясны. Лірычны герой не ведае, адкуль «ліецца хваляй песня, – ціхі, ясны гімн вясне»: мо яе разбудзіў «сінякрылы матылёк», які сваімі «дрыжачымі крыламі» звініць «у струнах сонца залатых», а можа, гэтая музыка нарадзілася ў сэрцы паэта, абуджаная сінім аганьком таго ж матылька. Музычная прастора ў вершы ствараецца не толькі дзякуючы своеасаблівай рытмічнай арганізацыі, але і дзякуючы руху мастацкай ідэі, што раскрывае і сутнасць музыкі як віду мастацтва. Жывы рух мастацкай думкі выяўляецца праз пластычныя, канкрэтныя вобразы і прадметныя рэаліі, праз моманты, імгненні, мімалётныя ўражанні, што ўвесь час змяняюцца, саступаючы месца іншым імгненням і ўражанням. Мастацкая ідэя акумулюецца ў рытме, гуках, словах і на пэўным этапе дасягае сваёй кульмінацыі: сцвярджэнне адзінства прыроды і чалавека, які чуе гэтую музыку вясны, музыку сэрца. Невыпадкова, што кампазітар А. Туранкоў паклаў верш на музыку, стварыўшы своеасаблівы сінтэз лірыкі і песні – вакальныя спевы.

Сінтэз мастацтваў адкрывае думцы бязмежныя магчымасці для спасціжэння мастацкага вобраза, закранае глыбінныя пласты эмацыянальнай сферы асобы, паказвае бясконцасць мастацкай прасторы культуры, у якіх хаваецца сутнасць унутранага свету чалавека, свету яго духоўнага жыцця. Такі сінтэз – музыкі і паэзіі – назіраецца ў «Рамансе» («Зорка Венера ўзышла над зямлёю…») М. Багдановіча, які адразу ж быў пакладзены на музыку і атрымаў усеагульнае прызнанне. Гэты сінтэзны жанр аказаўся запатрабаваны ў тагачасным грамадстве, асабліва ў гарадскім асяроддзі, якое шукала ў рамансе адлюстравання асобы чалавека са сваім інтымным унутраным светам, са сваімі марамі і жаданнямі. Мастацкую прастору раманса складаюць пастаянны рух і развіццё, што выяўляецца і ў рытме, і ў мелодыі, і ў змесце твора.

Музычную ж фактуру ў гэтым рамансе ствараюць спалучэнне і супастаўленне розных пластоў мастацкага тэксту, паўтарэнне аднолькавых нотаў, акордаў і музычных тактаў, што знаходзіць выяўленне ў пэўнай мелодыі,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

якая сугучная вершаванаму рытму і памеру. Яна падкрэслівае, узмацняе, набліжае, эмацыйна падтрымлівае тэму кахання, сум па ім. Дынаміка руху заўважаецца і ў змесце твора: у ім таксама дамінуе паўтор. Зорка Венера ўзыходзіць пры першым спатканні закаханых. Яна суправаджае ціхае, нясмелае каханне юнака, якое разгараецца, як тая зорка. І Венера напамінае ў далёкім краі пра каханне: «Буду ў далёкім краю я нудзіцца, / Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю; / Кожную ночку на зорку дзівіцца / Буду ў далёкім краю» [1, с. 77]. Кампазіцыйны паўтор узмацняе рух мастацкай ідэі – услаўленне кахання, усіх яго этапаў: і першую сустрэчу, і балючае расстанне, і неўміручасць любові.

Такім чынам, сінтэз мастацтваў – музыкі і лірыкі – дазваляе стварыць цэласную мастацкую прастору.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі, нататкі, чарнавыя накіды.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ